**Б.А. Крук**
(Мазыр, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна)

## АБ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ КУРСА «МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ»

Змены ў змесце і структураванні вучэбнага матэрыялу па беларускай мове і літаратурным чытанні ў пачатковай школе, кампетэнтнасны падыход і метапрадметнасць у навучанні, імклівая камп'ютарызацыя вучэбнага працэсу патрабуюць змен у падыходах да выкладання прыватных методык, у тым ліку і методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання. Я. Колас, разважаючы над пытаннем адбору і выкарыстання сродкаў, прыёмаў і метадаў навучання, падкрэсліваў, што "найлепшым метадам навучання будзе той метад, каторы найскарэй, найпрасцей, найлягчэй, найразумней вядзе да мэты" [1]. І гэтую акалічнасць, аналізуючы спадчыну Я. Коласа, адзначаюць многія аўтарытэтныя вучоныя і метадысты-практыкі [2].

Яшчэ ў "Вялікай дыдактыцы" Ян Амос Каменскі звяртаў увагу на тое, што не трэба ўбіваць у галовы моладзі "сумесь слоў, выразаў, думак", а патрэбна "раскрываць здольнасць разумець рэчы". З гэтай пазіцыі, якая, на наш погляд, надзвычай актуальная сёння, важнейшую ролю набывае ўменне самастойна працаваць з рознымі метадычнымі крыніцамі: аналітычнымі матэрыяламі, метадычнымі артыкуламі і распрацоўкамі ўрокаў, дыдактычнымі і дыягнастычнымі матэрыяламі, мультымедыйнымі прэзентацыямі і інш., бо самастойная праца спрыяе выпрацоўцы важнейшай прафесійнай якасці – кампетэнтнасці [3].

У такіх умовах выкладчыку неабходна скіроўваць увагу студэнтаў на карпатлівую штодзённую самастойную працу з метадычнымі дапаможнікамі, з часопісамі "Пачатковая школа", "Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа", "Начальная школа" і інш. Анкетаванне студэнтаў 2 і 3 курсаў завочнай формы атрымання адукацыі (спецыяльнасць "Пачатковая адукацыя"), праведзенае ў 2016/2017 навучальным годзе, паказала, што пераважная большасць студэнтаў – актыўныя чытачы навукова-метадычных часопісаў: на 2 курсе 21 студэнт сістэматычна карыстаецца метадычнымі часопісамі (з 27 студэнтаў групы), на 3 курсе – 27 студэнтаў (з 30 студэнтаў групы). Мы заўсёды акцэнтуем увагу студэнтаў на тое, што будучы настаўнік сам павінен шукаць, асэнсоўваць займальныя заданні, гульні, прыёмы, метады, рыхтаваць і праводзіць вусныя паведамленні па пэўнай метадычнай праблеме, адбіраць і выкарыстоўваць на занятках вучэбны матэрыял у звыклай і нетрадыцыйнай формах.

На вывучэнне методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання адводзіцца 280 гадзін, з якіх 140 – аўдыторныя. У завочнай форме атрымання вышэйшай адукацыі толькі 24 гадзіны – аўдыторныя. У такіх абставінах самастойная праца разглядаецца намі як сродак, які забяспечвае вывучэнне і паглыбленне ведаў па прадмеце, які актывізуе вучэбную дзейнасць студэнтаў. Дзейснымі відамі самастойнай працы, на наш погляд, з'яўляюцца вывучэнне метадычных крыніц і падрыхтоўка студэнтамі рэфератаў і паведамленняў.

Самастойная праца студэнтаў спрыяе не толькі трываламу засваенню ведаў, але і іх прафесійнаму станаўленню і самаразвіццю. Імкненне чалавека да самастойнага пазнання яскрава адлюстроўваецца і ў "пірамідзе запамінання", паводле якой засвойваецца 20 % пачутага, 30 % убачанага, 50 % убачанага і пачутага, 90 % – матэрыялу, да якога "дайшоў самастойна".

МГПУ им. И.П.Шамякина

Па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання адсутнічае сучасны падручнік (апошняе выданне датуецца 1986 годам). Таму ўсе віды заняткаў – лекцыйныя, практычныя, лабараторныя – максімальна забяспечваюцца падручнікамі для пачатковай школы, тлумачальнымі слоўнікамі тэрмінаў пачатковага навучання [4], вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, якія асвятляюць асобныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання і навукова-метадычнымі часопісамі “Пачатковая школа”, “Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа”, “Начальная школа”, якія маюць разнастайныя электронныя дадаткі.

Рознабаковаму прафесійнаму станаўленню студэнтаў спрыяюць самастойна падрыхтаваныя выступленні на лекцыйных і практычных занятках перад аўдыторыяй сваіх аднакурснікаў. Напрыклад, на лекцыі па тэме “Фарміраванне граматычных паняццяў” студэнтам даецца паняцце “разбор граматычны”. Студэнты самастойна, карыстаючыся слоўнікам, акрэсліваюць змест метадычных паняццяў “моўны разбор”, “разбор лексічны”, “разбор сінтаксічны”. Да кожнага раздзела курса методыкі распрацавана тэматыка рэфератаў (паведамленняў). На працягу семестра на практычных занятках кожны студэнт выступае з вусным паведамленнем (12–15 мінут), якое суправаджаецца падрыхтаванай студэнтам мультымедыйнай прэзентацыяй.

Да кожных практычных заняткаў студэнтам прапануюцца заданні для самастойнага выканання:

а) праблемныя пытанні методыкі;

б) заданні на падрыхтоўку і “прайграванне” фрагментаў урокаў навучання грамаце (чытання і пісьма), беларускай мовы, літаратурнага і пазакласнага чытання;

в) вусныя паведамленні на розныя тэмы;

г) складанне партытуры твораў і іх чытанне;

д) выбар і выкарыстанне прыёмаў і метадаў, іх абгрунтаванне;

е) узоры выразнага чытання мастацкіх твораў розных жанраў;

ж) слуханне запісаў мастацкага чытання твораў у аўтарскім выкананні;

з) узоры граматычных разбораў і інш.

Неабходна адзначыць яшчэ адзін аспект – самастойную працу студэнтаў з электроннымі сродкамі навучання (мультымедыйнымі дадаткамі да часопісаў), без якіх немагчыма ўявіць сучасны ўрок беларускай мовы і літаратурнага чытання. Студэнты выконваюць інтэрактыўныя заданні, знаёмяцца з “педагагічнай скарбонкай” настаўнікаў, авалодваюць методыкай працы з трэнажорамі па беларускай мове, засвойваюць матэрыялы віртуальных экскурсій і інш.

Практычны вопыт правядзення розных заняткаў па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Актыўнасць студэнтаў у час заняткаў павялічваецца, калі яны выступаюць з падрыхтаванымі самастойна вуснымі паведамленнямі, якія забяспечваюцца электроннымі прэзентацыямі.

2. Самастойна падрыхтаваныя і “прайграныя” на занятках фрагменты ўрокаў вызначаюцца ўменнем і здольнасцю студэнтаў дэманстраваць новыя прыёмы і сродкі вучэбнай дзейнасці.

3. У студэнтаў развіваюцца прафесійныя якасці: уменне асэнсоўваць свой педагагічны вопыт; самаацэнка сваіх педагагічных магчымасцей; самастойнасць у выбары прыёмаў, метадаў навучання і інш.

4. У працэсе сістэматычнай самастойнай вучэбнай дзейнасці ўжо на 3 курсе змяняюцца адносіны студэнтаў да сваёй вучобы: актыўная самастойная праца дазваляе ім даваць больш поўныя адказы, абгрунтоўваць выкарыстанне сродкаў, прыёмаў, метадаў; студэнты ўжо разважаюць на метадычныя аспекты, параўноўваць і супастаўляць розныя метадычныя падыходы.

**Літаратура**

1. Міцкевіч, К.М. Методыка роднае мовы // Зб. тв.: у 14 т. – Мінск: Маст. літ., 1976, Т. 12: Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. 1947 – 1956.– С. 313–506.

2. Яленскі, М.Г. Сучаснае прачытанне “Методыкі роднае мовы” К. Міцкевіча (Я. Коласа) / М.Г. Яленскі, А.У. Антонава // Пачатковая школа. – 2002. – № 7. – С. 6–8.



МГПУ им. И.П.Шамякина

3 Татур, Ю.Г. Компетентность в структуре модели качества подготовки специалиста / Ю.Г. Татур // Высшее образование сегодня. – 2004. – № 3. – С. 8–15.

4. Тлумачальны слоўнік тэрмінаў пачатковага навучання: Дапаможнік / Т.А. Кавальчук, І.Р. Кожух, Г.В. Сегянюк і інш.; Пад агул. рэд. праф. І.Р. Кожуха.– Мінск: БелЭН, 2001. – 272 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина